# Бюлетэнь

## Менскай гарадзкой арганізацыі БНФ "Адраджэньне"

(пра Фронт і для фронтаўцаў)

№ 2 студзень 1996 г. г.Менск

У сувязі з выхадам першага нумара бюлетэня я атрымаў шэраг прапаноў і крытычных заўваг як па яго зьместу, так і па накіраванасьці. Паспрабую адказаць на асноўныя зь іх.

Навошта ён патрэбны? Мы змагаемся за дэмакратычнае грамадзтва, за рынкавыя адносіны ў эканоміцы, стараемся зьмяніць умовы навакольнага жыцьця і пры гэтым мала клапоцімся пра ўласнае прыстасаваньне да гэтых зьмен. Зусім ня думаем пра тое, што ва ўмовах рынку палітычныя ідэі зьяўляюцца такім жа таварам, як і ўсё астатняе, а палітычныя арганізацыі—такія ж прадаўцы свайго тавару (ідэй), як і камерцыйныя фірмы. Як вядома, посьпех рэалізацыі тавару залежыць ня толькі ад яго якасьці, але і ў значнай меры ад рэклямы, ад таго, у якой упакоўцы і як ён падаецца пакупніку. Калі мы не навучымся прапаноўваць нашы ідэі выбаршчыку ў прывабнай для яго форме, то нас проста адсунуць на задні план іншыя арганізацыі. Законы рынку дзейнічаюць і ў палітыцы. Каб гэтага ня здарылася, трэба кожнаму старшыні рады, суполкі, дый значнай частцы шарагоўых фронтаўцаў умець прыгожа і даходліва выкладаць свае думкі як на словах, так і на паперы. Але для кожнага ўменьня патрэбна практыка. Калі ўласныя магчымасьці вуснай агітацыі многія з вас ужо апрабавалі ў пікетах, то ў друку не выступаў амаль ніхто. Ды і вашыя артыкулы ў газэтах асабліва ніхто не чакае. Каб запоўніць гэты прабел—задуманы бюлетэнь, які вы трымаеце ў руках.

Чаму для фронтаўцаў? Выданьне, накіраванае на зьнешняга чытача, павінна рабіцца выключна на прафесійным узроўні, каб ствараць прывабны імідж арганізацыі, а гэта, у сваю чаргу, патрабуе вялікіх грашовых сродкаў, якіх Фронт зараз проста ня мае. У той жа час, у Менску даўно насьпела неабходнасьць мець сваю газэту, каб у больш поўнай меры даводзіць інфармацыю да шараговых фронтаўцаў, чые суполкі ня маюць памяшканьня для сходаў і рэгулярна ня зьбіраюцца.

Чаму пра Фронт? Я лічу, што ў кожнага выданьня на інфармацыйным рынку павінна быць свая ніша, у якой яно будзе найбольш канкурэнтаздольным і зможа даваць такую інфармацыю, якую зацікаўленыя чытачы ня знойдуць больш нідзе. Пра міжнародныя і агульнабеларускія падзеі вы можаце прачытаць у "Свабодзе", "Народнай волі" і інш. Пра падзеі ў Фронце, пра ацэнку Фронтам тых ці іншых падзей, на сёньняшні дзень, нават многія шараговыя фронтаўцы даведваюцца праз трэція рукі і ў скажоным выглядзе. Да таго ж, падзяліцца вопытам практычнай дзейнасьці з аднадумцамі можна толькі праз уласнае выданьне.

Прыведзеная вышэй канцэпцыя выданьня зьяўляецца толькі маёй прапановай, яна нідзе афіцыйна не зацьвярджалася і можа быць зьменена з улікам вашых пажаданьняў.

## *Тэзісы да разумення задач Фронту ў святле нацыянальнай ідэі.*

**Пасылка 1: Выбары скончыліся; трэба шмат у чым вяртацца да пачаткаў.**
**Пасылка 2: Чым больш будзе беларускамоўных сьвядомых людзей, тым большы будзе электарат БНФ, бо мы сёньня—найбольш зразумелыя простаму чалавеку выразнікі ідэі беларускасьці.**

1. **Нацыянальная ідэя найбольш выразна сфармуляваная ў працах мысьляроў розных нацый. Гэта і Лейбніц, і Фіхтэ, і Данелейціс, і нашы Суліма, Купала, Абдзіраловіч.**
2. **Сёньняшняя нацыянальная ідэя базіруецца не на прынцыпе адзінства этнічнага паходжаньня, а на адзінстве інтарэсаў: культурна-адукацыйных, эканамічных, палітычных.**
3. **Пачынаць трэба зь сябе. Нічога ня вартая наша агітацыя за беларускасць, калі нават у многіх актывістаў Фронту жонкі і дзеці ўсё яшчэ адказваюць па тэлефоне па-расейску. Тут трэба быць настойлівым, і [redacted]**
   **Ня створым беларускамоўнага асяроддзя—ніколі ня будзем каля палітычнай улады. Першыя фронтаўцы хадзілі вучыцца на беларускія курсы—цяпер гэтага няма. Мы можам адчыніць пры нашым БГАКЦ вечаровыя курсы.** Л. БАРШЧЭЎСКІ

   **Цяпер сутнасьць ідэі.**

   **а) культурна-асьветніцкая:**

   - **усюды гаварыць па-беларуску,**
   - **сябраваць сем'ямі зь беларускамоўнымі людзьмі або пераводзіць іх у рэжым беларускамоўнасьці,**
   - **хадзіць хоць бы на ўсе бясплатныя беларускамоўныя імпрэзы (Дом літаратара—па 2-3 разы на тыдзень), наведваць беларускамоўныя сьпектаклі, фільмы, купляць беларускамоўныя кніжкі,**
   - **ніводнае дзіця фронтаўца не павінна вучыцца ў сярэдняй школе з рускай мовай навучаньня,**
   - **шчыльна заняцца беларускамоўнымі школамі і класамі,**
   - **выпісваць толькі чыста беларускамоўныя выданьні ;**

   **б) эканамічная (дзяржаўніцкая):**

   - **усюды паказваць, як нас рабуюць усе іншыя краіны, уключна зь немцамі і амэрыканцамі;**

   **в) палітычная:**

   - **усюды прапагандаваць беларускамоўных палітыкаў, нашы сімвалы, гісторыю, унікальнасьць беларускай дзяржавы.**

   **Гэта—не сектанцтва—пры ўмове нашай актыўнасьці.**

***Лявон Баршчэўскі***

# Інфармацыя з Сойму БНФ.

13 студзеня 1996 г. адбыўся Сойм Беларускага Народнага Фронту, на якім былі разгледжаны наступныя пытаньні:

1. Аб грамадзка-палітычнай сытуацыі на Беларусі.

Даклады: "Аб стратэгічных задачах Фронту" (З.Пазьняк)

"Тэзісы аб нацыянальнай ідэі" (Л.Баршчэўскі)

"Аб вайне паміж Расеяй і Чачнёй і злачынствах супраць чалавецтва"(Ю.Хадыка).

2. Аб перспектывах выбараў. (В.Каролік)
3. Аб падрыхтоўцы да ўгодкавых дат. (В.Сіўчык)
4. Аб падпісцы. (З.Пазьняк)
5. Аб крымінальна-палітычнай акцыі ўладаў супраць БНФ у Віцебску. (А.Чахольскі)

## Сойм прыняў некалькі заяў.

1. Аб "стратэгічным курсе" Расейскай Фэдэрацыі і абароне дзяржаўных інтарэсаў Беларусі.
2. Да гадавіны расейска-чачэнскай вайны.
3. Аб палітычна-крымінальнай акцыі ў Віцебску.
4. Да 700-х угодкаў дзяржаўнасьці беларускага нацыянальнага герба "Пагоня".

***(Поўныя тэксты заяў і прамоў, якія прагучалі на Сойме, Вы зможаце прачытаць у Бюлетэні Сойму БНФ "Адраджэньне".)***

## На Сойме былі прынятыя рашэньні:

1. Кожны сябра Фронту павінен падпісацца на газэту "Пагоня" і, па магчымасьці, падпісаць на яе яшчэ двух чалавек.
2. У кожным рэгіёне Беларусі вызначыць карэспандэнтаў для газэты "Пагоня". Накіроўваць у рэдакцыю газэты цікавыя артыкулы і паведамленьні.
3. У кожнай раённай радзе неабходна стварыць аргкамітэты па сьвяткаваньні 25 сакавіка. Абавязкова запланаваць мерапрыемствы на паветры. Таксама будзе ўтвораны агульнафронтаўскі аргкамітэт.
4. Праверыць у кожнай радзе стан вядзеньня і захоўваньня дакументацыі.
5. Раённым радам неабходна падрыхтаваць сьпісы кандыдатаў у дэпутаты раённых і Менскага гарадзкога саветаў па ўсіх акругах.

## • Інфармацыя.

- Украінскі Рух узнагародзіў Васіля Быкава і Беларускі Народны Фронт памятнымі медалямі, прысьвечанымі 50-м угодкам заканчэньня другой сусьветнай вайны.
- 30 студзеня ў 18-30 у "Беларускай Хатцы" адбудзецца вечарына "Мецэнаты на Беларусі".
- 4 лютага адбудзецца паездка на радзіму Касьцюшкі.
- 4 лютага а 12 гадзіне ў кінатэатры "Зьмена" будуць паказвацца фільмы пра Каліноўскага і Касьцюшку.
- 6 лютага плануецца імпрэза ў Нацыянальным музэі, прысьвечаная Касьцюшку.
- БНФ пачаў кансультацыі зь іншымі дэмакратычнымі арганізацыямі па стварэньні руху ў абарону Канстытуцыі.
- Ствараецца камітэт па абароне беларускай нацыянальнай сімволікі.
- Пачаў працаваць цэнтр "Супольнасьць". Для яго дзейнасьці неабходна інфармацыя пра беларускія маладзёжныя і дзіцячыя арганізацыі.
- Канфэдэрацыя беларускіх кансерватараў і Згуртаваньне беларускай шляхты вырашылі аб'яднацца ў Кансерватыўную партыю.

* * *

*Фронт, бы тая Пагоня, імчыцца --*
*Не зьвярнуць, не стрымаць, не спыніць.*
*На ўзбочыну лепш адступіцца,*
*Калі коньніца грозна ляціць.*

*Меч сячэ то направа, то ўлева,*
*Дзіда ворагаў зносіць зь сядла,*
*Рэюць сьцягі з чырвоным на белым --*
*За Радзіму змагацца пара.*

*Воі падаюць, падаюць коні,*
*Але часу няма на спачыў.*
*Не да палых імклівай Пагоні,*
*Яна рвецца на бой, на прарыў.*

*Праўда, ворагі хітрымі сталі,*
*Не жадаюць на полі стаяць,*
*Пахаваліся ўсе за мурамі,*
*Іх з наскоку з каня не узяць.*

*Год за годам імчыцца Пагоня.*
*Дзе тылы? Дзе абоз? Не відаць.*
*Усе ў пене зьнясілены коні.*
*м аўса ці хоць сена б задаць.*

*Адзін вораг зьмяняе другога,*
*За мурамі будуе муры.*
*Каб узяць іх, патрэбна аблога*
*Ды падкопаў і мінаў майстры.*

*А Пагоня наперад нясецца.*
*Яе бег не спыніць, не стрымаць.*
*Толькі рэха вакол раздаецца,*
*Толькі коні ляцяць і ляцяць.*

*Юрась Пальчэўскі*

## Аб'ява.

***У прэзідэнта ў жываце пачаліся колікі—***
***Ён ніяк не зразумее сэнс сваёй сімволікі.***

**Нагадваем!**

**Наш агульнанароднаізбранный празідзент абвясьціў конкурс і абяцае заплаціць 2 (два) мільёны рублёў таму, хто ўрэшце зможа растлумачыць яму**
**(гэта значыць, усенароднауважаемаму празідзенту):**
**За што мы ўсё ж такі павінны былі галасаваць на мінулым рэферэндуме?..**
**Дык не пакінем жа агульналюбімага празідзента аднаго ў яго няшчасьці!..**
**З нецярпеньнем чакаем вашых тлумачэньняў новай сімволікі ў выглядзэ вершаў, баек, малюнкаў і інш.**

**Галоўны рэдактар:** ***Юрась Пальчэўскі***